**Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята<br>(агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0113 -02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент * |
| **Кароткі змест** | Методыка выкладання беларускай мовы як навука, яе прадмет і задачы. Беларуская мова як вучэбны прадмет у школе. Фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі роднай мовы: мэта і змест моўнай адукацыі, працэс навучання мове, заканамернасці засваення мовы, развіццё маўлення. Сувязь методыкі беларускай мовы з іншымі навукамі. Сродкі навучання беларускай мове. Прынцыпы навучання беларускай мове як аснова адукацыйнай тэхналогіі. Паняцце метаду і прыёму навучання. Асновы класіфікацыі метадаў навучання. Прыёмы як дэталі метаду. Паняцце «ўрок». Структурныя кампаненты ўрока і іх функцыі. Асновы класіфікацыі ўрокаў, іх тыпы. Планаванне вучэбнага матэрыялу. План і канспект урока. Віды вучэбных планаў. Значэнне, змест, задачы вывучэння раздзела "Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія”. Мэта навучання арфаграфіі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Прынцыпы методыкі арфаграфіі. Значэнне, змест, задачы, прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі ў школе. Значэнне, змест і задачы вывучэння раздзела "Словаўтварэнне і арфаграфія». Значэнне і задачы вывучэння граматыкі ў школе. Асноўныя пытанні методыкі развіцця маўлення вучняў. Віды творчай працы па развіцці маўлення. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: ***ведаць:*** тэарэтычныя асновы Канцэпцыі моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і канцэпцыі вучэбнага прадмета “Беларуская мова”; заканамернасці ўзаемадзеяння выкладання беларускай мовы (дзейнасць настаўніка і кожнага вучня); сучасныя стратэгіі навучання беларускай мове, падыходы да арганізацыі навучання, яго сучасныя тэхналогіі; сутнасць працэсу навучання беларускай мове і ўмовы яго эфектыўнасці; мэты прадметнай адукацыі, прынцыпы адбору і структуравання вучэбнага матэрыялу, сродкі, метады і прыёмы навучання, формы і метады бягучага і выніковага кантролю; шляхі ўдасканалення арганіза-цыйных форм навучання беларускай мове, распрацоўкі новых навучальных сістэм і тэхналогій; ***умець:*** аналізаваць сродкі навучання беларускай мове; аналізаваць урокі; прадумваць метадычную структуру ўрока, паслядоўнасць і спосабы работы над новым матэрыялам, яго замацаванне, абагульненне і сістэматызацыю; папярэджваць памылкі і недахопы маўлення вучняў; прадумваць формы, метады і прыёмы бягучага і выніковага кантролю (праекціровачныя ўменні); распрацоўваць канспекты ўрокаў беларускай мовы; адбіраць у адпаведнасці з мэтамі ўрока вучэбны матэрыял, метады, прыёмы; выконваць навукова-метадычную работу, удзельнічаць у працы навукова-метадычных аб’яднанняў; аналізаваць уласную дзейнасць з мэтай яе ўдасканалення і павышэння сваёй кваліфікацыі. |
| **Прэрэквізіты** | “Педагогіка”. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі,108 акадэмічных гадзін, з іх 48 аўдыторныя: 24 г лекцый і 24 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамеж.атэстацыі** | 5-й семестр, экзамен. |